# 1986 ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ДЭЛЕГАТАМ XXX ГАРАДСКОЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 36 (636) | Субота, 27 снежня 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## АДЗІНСТВА СЛОВАМ І СПРАВАМ

**В. АСІПЕНКА,**
**першы сакратар гаркома ЛКСМБ.**

Рашэнні XXVII з'езда КПСС, іх мабілізуючая сіла аказваюць глыбокі ўплыў на дзейнасць кожнай камсамольскай арганізацыі, кожнага працоўнага калектыву горада.

У абстаноўцы высокага палітычнага і грамадскага ўздыму пярвічныя камсамольскія арганізацыі імкнуцца да пераадолення інертнасці, застою і шаблону ў рабоце, адмовы ад мерапрыемстваў, якія ўводзяць ад рэальных маладзёжных праблем, прывядзенню стылю, форм і метадаў камсамольскай работы ў адпаведнасць з патрабаваннямі часу, павышэнню свайго канкрэтнага ўкладу ў паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця працоўных калектываў.

Практычная накіраванасць становіцца усё больш характэрнай рысай дзейнасці ўсіх звенняў гарадской камсамольскай арганізацыі.

У адказ на заклік партыі і камсамола камсамольскія арганізацыі горада ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы XX з'езда ВЛКСМ і 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і знамянуюць першы год XII пяцігодкі новымі дасягненнямі ў працы. Больш 5 тысяч камсамольцаў падтрымалі ініцыятыву гамяльчан — дэлегатаў XXVII з'езда КПСС «Заданні кожнага года — да 7 лістапада, пяцігодкі — за 4,5 гады». У саставе 1067 КМК працуе звыш 12 тысяч маладых рабочых горада. Больш 6 тысяч маладых працаўнікоў датэрмінова справіліся з заданнямі першага года бягучай пяцігодкі. У цэнтры ўвагі знаходзіцца работа па прыцягненню моладзі да навукова-тэхнічнай творчасці.

Павысілася роля камсамольскіх арганізацый вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, ПТВ, камсамольскіх і піянерскіх арганізацый школ у барацьбе за якасць ведаў студэнтаў і навучэнцаў, актывізаваўся іх удзел у грамадска-карыснай дзейнасці. Школу працоўнага семестра штогод праходзяць 4 тысячы студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў.

Больш цесна ўвязваюцца з практыкай змест, формы і метады работы камсамольскіх арганізацый па ідэйна-палітычнай загартоўцы моладзі, фарміраванню ў яе актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Аднак тое, што было добра ўчора, і нават сёння, заўтра нас ужо не будзе задавальняць. Узраслі задачы, якія трэба вырашаць камсамольцам, усім працоўным калектывам горада.

За бягучую пяцігодку ў г. Гомелі неабходна значна павялічыць прырост прамысловай прадукцыі за кошт росту прадукцыйнасці працы. Патрабуецца далейшае ўдасканальванне арганізацыі будаўніцтва, забеспячэнне карэннага павышэння тэхнічнага ўзроўню і якасці прадукцыі. Усё гэта, бясспрэчна, патрабуе ініцыятыўнай і творчай работы ўсіх камсамольскіх арганізацый, моладзі.

Кожнай камсамольскай арганізацыі неабходна дакладна вызначыць сваё месца ў перабудове, якая ажыццяўляецца ў краіне, асэнсаваць, усвядоміць канчатковую мэту і шляхі яе дасягнення. Будзем шчырымі: у большасці арганізацый горада перамены нязначныя. Змяніўся тон выступленняў, з'явілася рэзкая крытыка. Але далей слоў справы не ідуць.

Перабудова пачынаецца толькі тады, калі за крытыкай і прапановамі ідзе карпатлівая і напружаная работа. Трэба перабудоўваць яе так, каб не распыляцца. І ў першую чаргу па павышэнню ролі камсамольскіх арганізацый у працоўнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат па паскарэнню сацыяльна-эканамічнага развіцця сваіх працоўных калектываў праз карэннае паляпшэнне якасці прадукцыі, навядзенне дысцыпліны і парадку ва ўсіх сферах дзейнасці.

Большай аддачы мы чакаем сёння ад Інстытута механікі металапалімерных сістэм, дзяржуніверсітэта, БІІЧТу, політэхнічнага, галіновых навукова-даследчых інстытутаў. Камітэтам камсамола неабходна сканцэнтраваць намаганні маладзёжных творчых калектываў на скарачэнні долі ручной працы, паўсюдным укараненні сродкаў малой механізацыі. Больш плённа трэба працаваць таксама гарадскому Савету маладых вучоных і спецыялістаў. Пакуль што ў яго рабоце зашмат засядальніцкай мітусні і праверак, а не канкрэтнай дапамогі пярвічным камсамольскім арганізацыям.

Асаблівую актуальнасць набываюць сёння пытанні ўдзелу камсамольцаў і моладзі ў барацьбе за карэннае паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі. Сем прадпрыемстваў горада пераводзяцца на яе дзяржпрыёмку. І задача ў нас адна — сярод камсамольцаў не павінна быць ніводнага бракароба, парушальніка працоўнай і тэхналагічнай дысцыплны. Неабходна ўзняць не на словах, а на справе ролю сацыялістычнага спаборніцтва, конкурсаў прафесіянальнага майстэрства.

У многім вынік недапрацовак камсамола ў тым, што пэўнай частцы моладзі яшчэ ўласцівы запозненае грамадзянскае ўзмужанне, утрыманства, нежаданне працаваць там, дзе патрэбна грамадству. Корні гэтай негатыўнай з'явы ў тым, што падлеткі, дзеці дрэнна ведаюць цану і радасць працы. Асноўнае пытанне школьнай рэформы — пытанне працоўнага выхавання рабят. Да канца пяцігодкі неабходна стварыць у кожнай школе горада круглагадовыя працоўныя атрады старшакласнікаў для работы ў прамысловасці, у сферы гандлю, сувязі, ва ўстановах аховы здароўя і інш.

Патрабуе вырашэння і праблема зацвярджэння прынцыпа самакіравання ў студэнцкіх аўдыторыях, маладзёжных інтэрнатах. Могуць жа камітэты камсамола ВНУ арганізаваць студэнцкія атрады, дзе ўсе пытанні жыцця і творчай дзейнасці рашаюцца самімі студэнтамі. А вось перанесці гэтыя прынцыпы ў паўсядзённае жыццё студэнтаў пакуль яшчэ не змаглі.

Слабым звяном у нашай рабоце з'яўляецца індывідуальная работа з моладдзю. Да нядаўняга часу мы працавалі ў асноўным з актывам, а астатняя частка моладзі засталася па-за ўвагай. І вось вынік — асобныя юнакі і дзяўчаты трапілі пад уплыў буржуазных сродкаў масавай інфармацыі. З'явіліся «рокеры», «металісты», або як цяпер іх называюць — нефармальныя аб'яднанні са сваімі нефармальнымі лідэрамі. А большасць жа з іх — камсамольцы. Сёння нам даводзіцца выпраўляць дапушчаныя хібы ў іх маральным выхаванні.

У нашых радах, на жаль, яшчэ хапае недысцыплінаванасці: парушаюцца статутныя патрабаванні пры пастаноўцы і зняцці з камсамольскага ўліку, уплаце членскіх узносаў. Перабудова стылю дзейнасці камітэтаў камсамола праходзіць яшчэ марудна. На нас давіць цяжар нашых недапрацовак у арганізацыйным умацаванні камсамольскіх радоў.

Галоўная задача сёння — усямернае развіццё ініцыятывы, павышэнне баявітасці і самадзейнасці кожнай пярвічнай камсамольскай арганізацыі.



**У Інстытуце механікі металапалімерных сістэм АН БССР працуе нямала моладзі, камсамольцаў. Сярод іх — і выпускнікі фізічнага факультэта Гомельскага дзяржуніверсітэта. У прыватнасці, у канцы 70-х гадоў сюды прыйшлі працаваць Ігар Злотнікаў і Рыгор Рэчыц.**

**Многія навуковыя распрацоўкі маладых супрацоўнікаў атрымалі высокую ацэнку. Сведчаннем гэтага з'яўляецца і прысуджэнне І. Злотнікаву, Ю. Варонежцаву, Р. Рэчыцу (на здымку злева направа) прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, якой ён ўдастоены сёлета.**

## АНКЕТА МАЯ І ТВАЯ

- **У гарадской камсамольскай арганізацыі — 88432 камсамольцы.**
- **У горадзе — 529 пярвічных камсамольскіх арганізацый.**
- **15 тысяч камсамольцаў горада — ударнікі камуністычнай працы.**
- **На гарадскую камсамольскую канферэнцыю выбрана 800 дэлегатаў, з іх:**
  - 28 удастоены ўрадавых узнагарод;
  - 53% — члены і кандыдаты ў члены КПСС;
  - 2 дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР;
  - 28 дэпутатаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў;
  - 325 маюць вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю.



**На здымку: дэлегат канферэнцыі трэцякурснік гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ, выдатнік вучобы Сяргей Лысенка. Знамянальным быў для юнака адыходзячы год: ён стаў кандыдатам у члены КПСС, за актыўную навукова-даследчую работу ўдастоены Дыплома II катэгорыі Мінвуза БССР.**

**Фота А. Рудчанкі.**

## НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

# З НОВЫМ ПАДЫХОДАМ

Галоўным стратэгічным рычагом інтэнсіфікацыі народнай гаспадаркі з'яўляецца паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу. Рашаючае слова тут за машынабудаўнічым комплексам.

Такая пастаноўка пытання ў поўнай меры адносіцца да камітэтаў камсамола прамысловых прадпрыемстваў. Менавіта на моладзь партыя разлічвае ў выкананні тых мерапрыемстваў па сацыяльна-эканамічнаму развіццю краіны, якія непасрэдна звязаны з укараненнем дасягненняў навукі і тэхнікі, прагрэсіўных тэхналогій.

Камітэтам камсамола і саветам маладых вучоных і спецыялістаў завода «Гідрапрывад» былі глыбока ўсвядомлены тыя маштабныя задачы, якія стаяць перад эканомікай краіны, і ў прыватнасці, калектывам нашага завода. Менавіта ў гэтым камсамольская арганізацыя знайшла кропку прыкладання сваіх сіл.

Першай праблемай, якую неабходна было вырашыць, з'явілася стварэнне двух часовых творчых маладзёжных калектываў, якія бралі на сябе, у рамках шырокамаштабнай акцыі, праводзімай абкомам камсамола, рашэнне канкрэтных вытворчых задач па ліквідацыі ручной працы. Створаныя калектывы ўзначалілі малады спецыяліст завода Д. Сіндалоўскі і аўтар гэтых радкоў. Для рашэння было ўзята 11 тэм з эканамічным эфектам каля 10 тысяч рублёў.

Больш палавіны запланаванага аб'ёму работ ужо выканана. Распрацавана дакументацыя на шматшпіндзельную насадку для вертыкальна - свідравальных станкоў лічбавага праграмнага кіравання і мадэрнізацыю агрэгатнага станка 2ХА764.

Немалаважнае значэнне пры арганізацыі тэхнічнай творчасці моладзі мае якасная падрыхтоўка маладых рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Гэта з'явілася другім напрамкам работы ў комплекснай праграме. З гэтай мэтай ва універсітэце тэхнічнай творчасці пры Палацы культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна прайшлі навучанне тры чалавекі, якія распрацавалі праграму школы «Асноў тэхнічнай творчасці» і прачыталі 44-гадзінны курс для 18 яе слухачоў. Вынік гэтага відавочны: пададзена 19 рацыяналізатарскіх прапаноў, рыхтуюцца 3 заяўкі на мяркуемыя вынаходніцтвы. Камітэт камсамола завода стварыў на базе існуючай школы клуб тэхнічнай творчасці, асноўным напрамкам у рабоце якога стала вывучэнне перспектыўнага даследчага метаду ў машынабудаванні, а таксама рашэнне актуальных тэхнічных задач.

Камітэт камсамола, савет маладых вучоных і спецыялістаў знаходзяцца ў пачатку шляху. Наперадзе — яшчэ шмат праблем, аднак ёсць упэўненасць у тым, што праводзімая работа ў самы бліжэйшы час ужо дасць свае істотныя вынікі.

**В. ЦІМОХАЎ,**
**сакратар камітэта камсамола ВА «Гідраўтаматыка».**

*Школа—на шляху рэформы*

# ДЛЯ ГАРМАНІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Ужо трэці год як ажыццяўляецца рэформа агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Натуральна, гэта ўскладвае на нас, школьнікаў, асаблівую адказнасць за якасць вучобы, за захаванне вучэбнай і працоўнай дысцыпліны. Задачу камітэта камсамола, школьнага актыву мы бачым у накіраванні сіл школьнікаў на паспяховае авалоданне вучэбнай праграмай. Іменна гэтаму падпарадкавана разгорнутае сёлета сацыялістычнае спаборніцтва паміж камсамольска-маладзёжнымі калектывамі фабрыкі «8 Сакавіка» і пярвічнымі камсамольскімі арганізацыямі нашай школы пад дэвізам: «Мы — у вучобе, вы — у вытворчасці».

Камітэт камсамола школы шукае шляхі далейшага развіцця грамадскай актыўнасці камсамольцаў, далучэння іх да самастойнай работы ў органах школьнага самакіравання, а таксама аб'яднання іх рознымі формамі самадзейнай творчасці, арганізацыі вольнага часу. Палітычны клуб «Праметэй», школьныя камсамольскія і піянерскія агітбрыгады, драматычны тэатр «Каскад», спартыўны клуб «Факел», атрад «Дзяржынец» сваёй дзейнасцю з'арыентаваны на фарміраванне ініцыятыўнай, творчай асобы. А яшчэ мы вырашылі стварыць секцыю рытмічнай гімнастыкі, клуб «Што? Дзе? Калі?», фальклорны ансамбль.

Адной з самых распаўсюджаных форм арганізацыі адпачынку моладзі сталі, як вядома, танцавальныя вечары, дыскатэкі. Тут мы сутыкаемся з праблемамі: як танцаваць, што танцаваць, пад якую музыку? Нас вельмі хвалюе пытанне: «Што нам спяваюць?» Думаем, што складаннем музычных праграм школьных дыскатэк павінны займацца спецыялісты, музыканты. У сувязі з гэтым прапануем стварыць у горадзе (пры гаркоме камсамола) адпаведны цэнтр. Скажам, «Школьная дыскатэка». Гэты цэнтр павінен рыхтаваць праграмы, праводзіць кансультацыі для арганізатараў школьных дыскатэк. Мяркуем, што арганізатарам адпачынку моладзі варта задумацца над стварэннем такога цэнтра. Упэўнены, што школьнікі-старшакласнікі ўсяго горада нашу прапанову падтрымаюць.

**А. ГУШЭЛЬ,**
**сакратар камітэта камсамола СШ № 10.**

НАШ ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК

# НА АХОВЕ ПРАВАПАРАДКУ

**Сёмы год на радыёзаводзе імя 60-годдзя СССР, дзейнічае аператыўны камсамольскі атрад ДНД. Пра тое, што зроблена за гэты перыяд, расказвае намеснік сакратара камітэта камсамола Ігар ВАРУШЧАНКА.**

— Працуем мы па розных напрамках. Гэта і рэйды па лініі аддзела барацьбы з раскрадальнікамі сацыялістычнай маёмасці, з работнікамі крымінальнага вышуку, дзяжурствы на вечарах адпачынку, на дыскатэках, арганізуемых на заводзе і ў горадзе. Камсамольцы прымаюць удзел у ахове грамадскага парадку на вуліцах раёна, дапамагаюць супрацоўнікам міліцыі выяўляць парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і антыалкагольнага заканадаўства. Адным з галоўных участкаў у нас лічыцца работа з непаўналетнімі, якія стаяць на ўліку ў органах унутраных спраў.

Трэба прызнаць прама: цяпер у горадзе і асабліва ў Савецкім раёне склалася даволі трывожная абстаноўка. Сярод моладзі ёсць нямала правапарушальнікаў, усё часцей назіраюцца факты таксікаманіі і наркаманіі. Гэтае вялікае грамадскае зло патрабуе неадкладнай і рашучай барацьбы. Сваёй першачарговай задачай мы лічым выяўленне крыніц узнікнення і распаўсюджвання крайне небяспечных звычак, папярэджанне іх. Для аператыўнай і больш паспяховай работы падключаем да яе юных дзяржынцаў з падшэфных школ № 36 і № 46.

Каму, як не самім рабятам, лепш вядома, хто з іх аднагодкаў схільны да шкодных усемагчымых адурманьваючых рэчываў.

За нашым атрадам цяпер замацаваны 32 падлеткі, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Мы пастаянна кантралюем, чым яны займаюцца ў вольны ад вучобы час, цікавімся іх поспехамі ў школе, вучылішчы або на рабоце, гутарым з іх бацькамі, настаўнікамі. Адчуваючы пастаянны клопат да сябе, рабяты імкнуцца пераасэнсаваць сваю жыццёвую пазіцыю, паступова перавыхоўваюцца. Чацвёра нашых падапечных ужо зняты з уліку інспекцыі. Астатнія таксама не допускаюць правапарушэнняў.

Для работы з непаўналетнімі патрэбны людзі, якія ўмеюць знайсці да іх падыход, прывесці пераканаўчыя довады па канкрэтнаму пытанню, тыя, хто валодае пэўным педагагічным дарам. На жаль, такіх выхавацеляў у нас яшчэ мала. На наш погляд, у гэтым напрамку трэба працаваць разам з важатымі з вытворчасці.

За гэты год мы правялі 17 рэйдаў па выяўленню раскрадальнікаў сацыялістычнай уласнасці на гарадскім малочным камбінаце. Было затрымана 7 несуноў. Члены атрада правяралі таксама захаванне правілаў гандлю хлебам і таварамі павышанага попыту, размеркавання дэфіцытных прадуктаў у заводскіх сталовых і кулінарыі. У рабоце дружыннікаў найбольш актыўна ўдзельнічаюць Аляксандр Кір'янаў, Тамара Шафаранка, Мікалай Батура, Ніна і Юрый Таўсценкі, Сяргей Ісцэрын.

Праяўляюць пільнасць нашы дружыннікі і пры патруліраванні па раёну. Мінулай вясной камсамольцы Уладзімір Мазураў і Юрый Сцепаненка затрымалі групу падлеткаў на праспекце Кастрычніка, якія спрабавалі абрабаваць кіёск. Цяпер Валодзя ўзначальвае раённы аператыўны камсамольскі атрад дружыннікаў.

Многае зроблена нашым аператыўным атрадам па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам. Пры правядзенні рэйдаў пастаянна праяўляюць актыўнасць камсамольцы Сяргей Іваноў, Уладзімір Куранда, Ігар Мельнікаў, Алена Цеглянкова, Сяргей і Алена Дунаевы, Сяргей Дзяржынскі. Прыклад падаюць таксама сакратары камсамольскіх арганізацый заводакіраўніцтва і цэха № 23 Вольга Швідзянкова і Наталля Абрамцава.

Аднак нельга сказаць, што ў дзейнасці нашага аператыўнага атрада няма праблем. Яны ёсць. Першая — дабіцца актыўнасці кожнага яго члена. Немалаважным, думаецца, і разумнае спалучэнне матэрыяльных і маральных стымулаў для тых, хто частку свайго вольнага часу аддае вельмі патрэбнай для сацыялістычнага грамадства спра-

ТВОІ АДПАЧЫНАК

# СЛУЖЫЦЬ ЗДАРОЎЮ

У вытворчым аб'яднанні «Гомсельмаш» вядзецца планамерная і мэтанакіраваная работа па далейшаму ўмацаванню здароўя працоўных, укараненню фізкультуры і спорту ў паўсядзённы быт сельмашаўцаў.

У нас стала традыцыяй праводзіць масавыя спартыўныя мерапрыемствы, зімовыя і летнія спартакіяды сярод цэхаў і аддзелаў завадскіх маладзёжных інтэрнатаў. Штогод праводзяцца традыцыйныя спаборніцтвы на прызы героя вайны і працы, розыгрышы кубкаў па ігравых відах спорту, спартыўныя святы, прысвечаныя знамянальным датам.

Напярэдадні Дня Перамогі па вуліцах завадскога мікрараёна праходзіць масавая лёгкаатлетычная эстафета на прыз Мікалая Дворнікава — сакратара першай камсамольскай ячэйкі «Гомсельмаша». Гэтае яркае маляўнічае мерапрыемства пачынаецца з мітынгу, на якім заўсёды прысутнічае брат героя Васіль Мікалаевіч Дворнікаў. У эстафеце абавязкова прымае ўдзел і каманда камітэта камсамола нашага вытворчага аб'яднання.

Акрамя спартыўных, цікава і прадстаўніча праходзяць многія іншыя спаборніцтвы. Да месца нагадаць конкурсы 16 завадскіх інтэрнатаў: «Ану, дзяўчаты!» і «Ану, хлопцы!». На іх сабралася столькі гледачоў і балельшчыкаў, што спартыўная зала не змагла ўмясціць усіх жадаючых.

Кожны год мы праводзім турыстычныя злёты ў рамках Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы КПСС і савецкага народа. У іх праграму ўваходзяць спартыўнае арыентаванне на мясцовасці, пераадоленне паласы перашкод, стральба з пнеўматычнай вінтоўкі, гонкі на байдарках, конкурсы песні, насценных газет і многае іншае. Турысцкія злёты пачынаюцца ў структурных падраздзяленнях і канчаюцца фіналам, у якім прымаюць удзел прадстаўнікі ўсяго аб'яднання, заваяваўшыя на гэта права.

У аб'яднанні праводзяцца таксама агітпрабегі па месцах баявой славы. Калоны матацыклістаў і аўтааматараў з флагамі і лозунгамі пабывалі ў Прыбалтыцы і Брэсце, Хатыні і Адэсе. Мінулым летам агітвелапрабег, прысвечаны дню вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 45-годдзю подзвіга экіпажа Мікалая Гастэлы, прайшоў па маршруту Гомель—Мінск—Радашковічы і фінішаваў каля помніка гераічнаму экіпажу. Цяпер пры спартыўным клубе ствараецца клуб аматараў велатурызму, адной з задач якога будзе правядзенне падобных прабегаў.

У апошні час нашы камсамольцы праяўляюць шмат клопатаў аб паляпшэнні спартыўнай базы. У нерабочы час іх сіламі пабудавана больш 10 спартыўных пляцовак у раёне маладзёжных інтэрнатаў, завадскога стадыёна і нават на тэрыторыі завода. Амаль не пустуюць спартыўныя залы мікрараёна ў вячэрні час і выхадныя дні з прыходам зімы. Фізкультура і спорт цвёрда сталі на службу здароўя сельмашаўцаў.

**А. ДАЛГАРУКАЎ,**
**нам. сакратара камітэта камсамола ВА «Гомсельмаш».**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

А353619

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.
Заказ 931.